Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: ***e-krama.com, pahonia.com***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
✉ ***P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735***

№ 3 (589)
Сакавік 2015 г.

Лютаўскі сход "Пагоні" і дабрачынны канцэрт



У суботу, 14 лютага, у Нью-Ёрку адбыўся сход і дабрачынны канцэрт, ладжаны Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня". Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня Віталь Зайка выступіў з кароткай інфармацыяй пра падзеі ва Ўкраіне, ён нагадаў, чаму яны маюць такі вялікі ўплыў на Беларусь, і чаму беларусы мусяць дапамагаць сёньня братам-украінцам. Менавіта таму ўсе ахвяраваньні, сабраныя на канцэрце, было вырашана перадаць на патрэбы параненых на вайне ўкраінскіх жаўнераў.

Затым сп. Зайка прадставіў прысутным барда Сяржука Сокалава-Воюша. Сп. Сокалаў-Воюш распавёў пра культурніцкія і братэрскія сувязі паміж беларусамі й украінцамі. Слынны бард выканаў свае знакамітыя песьні, такія як "Беларусь мая" ("Аксамітны летні вечар"), "Баляда пра князя", "Маналёг Францішка Багушэвіча", "Анжэла дэ Лабард", "Маналёг Валерага Ўрублеўскага", "Вільня", "Прыстанкі", "Мы з табою, каханая", "Песьня пра Грунвальд" ("Верны конь"), "Ніколі".

Сп. Сокалаў-Воюш праводзіў свой канцэрт у вельмі інфарматыўным і цікавым фармаце, перамяжаючы сьпевы пад гітару з аповедамі з асабістага досьведу пра розныя прыклады супрацы беларусаў і ўкраінцаў. Прагучэлі таксама вершы Францішка Багушэвіча і Тараса Шаўчэнкі.

Затым бард выканаў творы з пазьнейшых і зусім новых нізак "Песьні лісоўчыкаў", "Граблі", прагучэў надзённа і "Звон" ("Гэй, Беларусь – на Майдан! "). Новая песьня "Случчак" была напісаная акурат пад леташні Дзень Герояў (Угодкі Слуцкага Збройнага Чыну).

Апошнімі песьнямі канцэрту сталі выкананыя разам усімі прысутныя беларускі й украінскі нацыянальныя гімны – "Мы

заканчэньне на бачыне 2

Ахвяраваньні пойдуць на дапамогу беларуска-ўкраінскай сям'і

На вайне ёсьць месца подзьвігу нават... сувязісту, хоць загаду йсьці ў бой супраць сэпаратыстых ім не даюць. Але такі бой прыняў 35-гадовы жыхар пасёлку Падгорнае Днепрапятроўскай вобласьці Сяргей Тоўсьцік (Сергій Товстик) – бацька двух дзяцей.

Сяргей – радыёаматар зь дзяцінства, сувязіст, інжынэр у наладцы й суправаджэньні камунікацыйнага абсталяваньня, сам пайшоў у ваенкамат і запісаўся дабраахвотнікам.

Ён кажа: "У 1998–99 гадох я прайшоў тэрміновую службу. Паводле вайсковай спэцыяльнасьці я інжынэр сувязі і, калі ў красавіку я пайшоў дабраахвотнікам, зьбіраўся быць тэхнічным спэцыялістам. Я ня буду казаць прыгожых словаў, ёсьць рэчы, якія ня маюць тлумачэньняў – іх проста трэба рабіць і ўсё".

Сяргей быў прызначаны ачольнікам перасоўнай радыястанцыі на базе Зіл-131 у 93-ю асобную механізаваную брыгаду. На пярэднім краі апынуўся 1 чэрвеня летась і да таго як быў паранены пасьпеў паслужыць у штабох у Днепрапятроўскай, Харкаўскай і Данецкай вабласьцях у самых гарачых кропках – пад Ясінаватай, Горлаўкай і Енакіевым.

"Я пераважна пры штабе знаходзіўся ў базавых лягерох, якія мяняў кожныя 2–3 тыдні. А потым пачаў браць ініцыятыву і ў жніўні-верасьні выяжджаў на баявыя заданьні, пераважна як ахоўнік.

У той дзень, 13 верасьня, калі пачалося першае замірэньне, мы выехалі шукаць наш кабель сувязі. Прыехалі на адзін з блёкпастоў недалёка ад пасёлку Чырвоныя Партызаны. Тут перачакалі мінамётны абстрэл, а потым атрымалі вестку, што ў бок іншага блёкпаста рухаюцца тры варожыя танкі. Мы ведалі, тую пазыцыю ахоўвае менш як палова штату, і разумелі, што ў гэткім складзе хлопцаў проста зьнішчаць. Мы прынялі самастойнае рашэньне без загаду паехаць і вывезьці адтуль нашых".

Сувязісты выправіліся па сваіх на БМП, маючы толькі два гранатамёты й аўтаматы. Не даехаўшы да блёкпаста, хлопцы заўважылі танк сэпаратыстых.

"Я падняў гранатамёт і стрэліў, але адначасна трапілі й па мне. Танк я падбіў, аднак мне адарвала вышэй лакця левую руку, а правую – моцна раздрабніла. Было цяжка, але мы пастанавілі спачатку забраць нашых – выратавалі ўсіх, а ўжо потым везьці мяне ў шпіталь".

У цяжкім стане Сяргея, які таксама быў яшчэ паранены ў твар, атрымаў кантузію й часткова страціў слых, валянтэры прывезьлі ў шпіталь. Спадзяваліся ўратаваць правую руку, у якой была зламаная плечавая й раздрабнёная локцявая косткі ды перабітыя артэрыя й судзіны.



Сяргей да вайны з жонкаю і дачкою

Каб аднавіць крывазабесьпячэньне, зрабілі дзьве апэрацыі, выразалі з нагі судзіну й ушылі ў руку. Але пасьля месяца змаганьня й кансультацыяў з Аўстрыі мэдыкамі руку ўсё ж ампутавалі.

"Хочацца быць яшчэ карысным краіне й сям'і. Праз два месяцы ўжо можна будзе замаўляць пратэзы – адзін з суставам, другі – без, але пакуль што нам ніхто яшчэ нічога дакладнага не сказаў. Невядома, ці варта зьвяртацца за мяжу, ці можна добры пратэз зрабіць ва Ўкраіне", – гэтыя словы Сяргей сказаў на пачатку сьнежня 2014 г. Цяпер мы ведаем, што кошт складнікаў, зь якіх украінскія лекары могуць вырабіць вартыя героя пратэзы, складае каля 200 тыс. даляраў.

Жонка Сяргея – Алеся родам са Жлобіна, як сапраўдная беларуска, пастанавіла сабраць патрэбную суму. На адзін пратэз грошы ўжо ёсьць.

Слава Ўкраіне!

Жыве Беларусь!

Сяржук СОКАЛАЎ-ВОЮШ

(паводле газэты "Сегодня" ад 5 сьнежня 2014 г.)



У шпіталі ў Львове

Лютаўскі сход і канцэрт

Заканчэньне зь 1-й бачыны

выйдзем шчыльнымі радамі" і "Шчэ ня вмэрла Ўкраіна".

Канцэрт быў вельмі цёпла і з энтузіязмам сустрэты прысутнымі. На сход і канцэрт прыйшло больш за 50 сяброў і гасьцей, і было сабрана каля 2000 даляраў ахвяраваньняў. Гэтыя сродкі пойдуць на пратэзы для цяжка параненага ўкраінскага патрыёта з Днепрапятроўскай вобласьці Сяргея Таўсьціка, які ў вайне на ўсходзе Ўкраіны згубіў абедзьве рукі.

Найбольш дапамаглі ў падрыхтоўцы й правядзеньні імпрэзы сям'я Сяржука Сокалава-Воюша (жонка Ганна і сыны Сьветавіт і Славамір), а таксама Пётар і Алена Рыжыя, Марат Клакоцкі, Віктар Едзіновіч.

Сп. Віктар Дудараў рабіў відэа і фатаздымкі імпрэзы.

Віталь ЗАЙКА




“Відымусы” Лявона Юрэвіча

Юрэвіч, Лявон. Відымусы. Мінск: Лімарыус, 2015. — 180 с.

Новая кніга беларускага дасьледніка-архівіста зь Нью-Ёрку Лявона Юрэвіча, што пабачыла сьвет у менскім выдавецтве “Лімарыус”, названая старажытным словам “відымусы” – копіі, выпіскі з архіўных дакумэнтаў.

Невялікае паводле памеру выданьне (180 старонак) складаецца з кароткіх цытатаў ці пераказаў эпісталярыяў, мастацкіх твораў, артыкулаў і інш. тэкстаў, створаных як эміграцыйнымі, гэтак і мэтрапольнымі аўтарамі. Камэнтары да тых выпісак – мінімальныя, што дае магчымасьць чытачу самому рабіць высновы з прачытанага. Часам аўтарская пазыцыя выяўляецца толькі ў назове чарговага відымусу або ў самым падборы сюжэтаў.



У якасьці герояў кнігі выступаюць і клясыкі, кшталту Янкі Купалы ды Якуба Коласа, і менш ведамыя ў Беларусі аўтары ці дзеячы, напрыклад, Мікола Дзямідаў, Аляксандар Ружанцоў, Алесь Карповіч ды іншыя (у іменным пакажьніку пазначаныя больш за 500 асобаў). Як адзначае ў прадмове літаратуразнаўца Ганна Кісьліцына: “У Юрэвіча-дасьледчыка ёсьць дзіўны талент – пісаць партрэты адной дэтальлю, але дэтальлю невыпадковай, сутнаснай, абумоўленай самым жыцьцём і лёсам. Нехта можа сказаць, што гэта не партрэты, а хутчэй шаржы. Можа быць, але вельмі яркія і запамінальныя”.

Выкарыстаныя аўтарам дакумэнты, часам агульнадаступныя, як збор твораў Якуба Коласа, але пераважна – архіўныя эміграцыйныя, захаваныя ў БІНіМе. Напэўна, найбольш цытуюцца тэксты з эпісталярыяў Антона Адамовіча, Юркі Віцьбіча, Масея Сяднёва, Вітаўта Тумаша. Такім чынам, Лявон Юрэвіч на старонках “Відымусаў” уводзіць у айчынную гістарыяграфію і літаратуразнаўства значную колькасьць новых крыніцаў.

Тэматыка і храналёгія відымусаў разнастайная. Аўтар-архівіст нібыта занатоўвае для памяці ўсё, што падаецца яму цікавым з тае ці іншае нагоды. Гэта можа быць непісьменны тэкст бальшавіцкай улёткі часоў усталяваньня савецкай улады, біяграфічная нататка аўтара “Беларускай Марсельезы” Юліяна Сергіевіча, развагі пра правільнасьць выкарыстаньня словаў “балонка” і “бачына”, рэфлексіі з нагоды наданьня вайсковых званьняў эміграцыйным дзеячам і г. д. Зь відымусаў можна даведацца і пра асаблівасьці выдавецкай кухні студэнцкага эміграцыйнага пэрыёдыка, і пра падрабязнасьці побытавага жыцьця першагерарха БАПЦ, пра “Згвалчаную дзяжу” або пра ваенныя гады Валянціна Таўлая. На старонках кнігі чытач знойдзе розныя варыянты публікацыі аднаго верша Ўладзімера Жылкі і малаведамыя творы Пётры Сыча. 171 маленькі тэкст, самадастатковы, завершаны, часта кур’ёзны, сьмешны, які прымушае задумацца над нейкай канкрэтнай сытуацыяй ці праблемай. Аўтар часам дае падказкі іншым дасьледнікам, на якія тэмы, аспэкты, герояў варта зьвярнуць увагу, або дэманструе новы ракурс раней ведамай зьявы.

“Відымусы” Лявона Юрэвіча – новы жанр айчыннай літаратуры і крыніцазнаўства. Кніга можа быць карысным і нават захапляльным чытвом як для прафэсіяналаў (архівістаў, гісторыкаў, літаратуразнаўцаў), гэтак і для аматараў беларускай мінуўшчыны, сучаснасьці ды прыгожага пісьменства.

Натальля ГАРДЗІЕНКА

Тутэйшыя, адгукніцеся!

Двайм лепей, чым аднаму, бо ёсьць ім добрая дзяка за іхнюю працу.
Бо, як адзін упадзе, падыме другі свайго сябра!
Але гора таму, хто адзін упадзе, а другога няма, хто падняў бы яго.
Гэтак сама, як двое ляжаць, дык ім цёпла; а дзе аднаму прыгрэцца?
(Эклезіяст 4:9-11)

У новай краіне з іншымі парадкамі, моваю, культураю і сьветаўспрыманьнем, кожны сутыкаецца з аднымі й тымі ж праблемамі і нават ня ведае з чаго пачынаць. І жыльлё патрэбна, і праца, і сяброў новых знаходзіць, і ўсё чужое, незнаёмае. А сустрэнеш земляка – аж на душы цяплей, бо нас аб’ядноўвае край, адкуль прыехалі. І задаем мы тут адзін аднаму аднолькавыя пытанні: “Як імя? Адкуль? Як даўно прыехаў? Дзе жывеш? Дзе працуеш? Ці добра зарабляеш?”. А пытаньняў, увогуле, “поўны мех”, і пра курсы ангельскай, і пра мэдстрахоўку, і пра адвакатаў, і пра крэдыты, зьніжкі, матэрыяльную дапамогу і г. д. Нажаль, ня кожны ведае адказы на ўсе пытаньні. На гэта і разлічаныя суполкі і аб’яднаньні, дзе зьбіраюцца і новыя, і дасьведчаныя людзі, і кожнаму ёсьць што распавесьці аб жыцьці ў ЗША, падзяліцца сваім досьведам.

Выдатна, што мы маем Згуртаваньне “Пагоня”, што ладзіць штомесячныя сходы, дзе мы гутарым на роднай мове, атрымоўваем парады. Але ня ўсе маюць час і магчымасьць наведваць гэтыя сустрэчы. А тыя хто прыходзіць, незаўсёды ведаюць, як запытаць штосьці, ці проста саромеюцца.

Кіраўнікі “Пагоні” імкнуцца рабіць сходы цікавымі й інфарматыўнымі, але гэта не дзяржава, дзе вы плоціце падаткі і чакаеце, калі ўрад для вас нешта зробіць. “Пагоня” – як раз той выпадак, калі ў працы павінны браць удзел усе.

З каго трэба браць прыклад, дык гэта з суполак кітайцаў, італьянцаў, гэбраяў, лацінаў. Яны маюць моцныя арганізацыі і дасягнулі добрых вынікаў у вырашэньні дзьвюю асноўных задачаў. Першая: тых хто нарадзіўся і выраслі тут – вучыць традыцыям, мове, культуры іхных продкаў; другая: новапрыбылым дапамагаюць адаптавацца і ўладкавацца ў новай краіне. У дасягненьні гэтых мэтаў удзельнічаюць усе: хто досьведам і ідэямі, хто грашыма, а хто і проста сваімі рукамі.

Зьвернемся да гісторыі. У 1897 годзе выхадзец зь зямлі беларускай Абрам Каган заснаваў ў Нью-Ёрку газэту “Jewish Daily Forward”, у якой была калёнка “Bintal Brief”, якая карысталася шалёнай папулярнасьцю, чытачы пісалі аб сваіх асабістых праблемах і выпадках з жыцьця ў ЗША.

На мой погляд, гэта цудоўная ідэя, якую трэба выкарыстаць і ў нашай “Пагоні” з дапамогаю інфармацыйнага бюлетэня “Весткі й Паведамленьні”. Таму заклікаю дасылаць вашыя пытаньні, на якія б вы хацелі пачуць адказы (юрыдычная дапамога, праца, пачкі на Беларусь, курсы, страхоўка) ці, наадварот, гісторыю, у якой вы знайшлі вырашэньне вашых праблемаў. Не сумнявайцеся, ваш досьвет будзе карысны шмат каму яшчэ. Па магчымасці, я буду апрацоўваць іх і друкаваць у “Вестках і Паведамленнях” і ў анлайн рэсурсах.

Галоўнае – не заставайцеся абыякавымі, далучайцеся. Дапаможаш ты – дапамогуць і табе. Разам лягчэй!

Вашы пытаньні ці гісторыі дасылайце, калі ласка, у электронным варыянце пад тэмаю *“Дзелімся вопытам”* на адрас **sharkohanna@gmail.com** ці лістом па пошце на адрас:

Hanna Sharko
1829 74th Street
Brooklyn, NY 11204

Ганна ШАРКО

"Галгатня пра ЗыШыА"

...а ён кажа: "божая раса"

Іўсё ж такі канец сьвету набліжаецца. Паводле "дасьледаваньня" Джона Гопкінса з 2011 году, 35% амэрыканскіх мужчынаў сікае седзячы. Невядома, праўда, які адсотак гэта робіць сапраўды, а які прагне такім прызнаньнем спадабацца жанчынам, бо хочацца верыць, што дасьледаваньне праводзілася шляхам не эмпірычным, а з дапамогаю апытаньня. Ну, "чэснае піянэрскае" я магу даць таксама. Тым больш, што ўся гэтая піянэрская зараза вядзе свой радавод ад бацылы Маркса, якая перш гадавалася на амэрыканскіх унівэрсытэтах, а пасьля пад прыкрыцьцём ночы, была перакінутая на падатлівую глебу эўрасаюзаўскіх грамадзкіх установаў.

Надоечы, нямецкі суд у Дусэльдорфе стаў на бок мужчынаў і дазволіў ім працягваць мачыцца стоячы. Такая навіна магла б нават цешыць, каб не відавочная "апалягецкая" фармулёўка судовай пастановы, у якой судзьдзя Штэфан Ганк сьцьвярджае: "Нягледзячы на ўсё большае акультурваньне (ужыта слова „даместыкацыя", як у кантэксьце жывёлаў) мужчын у гэтай вобласьці, мачэньне стоячы сапраўды зьяўляецца пакуль яшчэ пашыранай практыкай". Магчыма, што гэр Ганк гадаваўся бяз бацькі, а магчыма, што ў судзьдзі вельмі лютая, архэтыпічна-нямецкая фраў. А можа судзьдзя таксама з піянэраў?



Нямецкіх мужыкоў так узялі за... горла, што "сядзячы сікун" (sitzpinkler) хутка стаўся сынонімам „сцыкуна", мужыка-анучы, якім сымбалічна выціраюць тэрыторыю, загаджаную сапраўднымі, некультурнымі самцамі. Дзеля змаганьня з гэтакім кляймаваньнем прыдумалі прыладу, якая голасам колішняга канцлера Нямеччыны, яшчэ аднаго вядомага піянэра Герхарда Шродэра, абуралася: „Гэй, сікаць стоячы забаронена, і ты будзеш пакараны штрафам, таму калі ня хочаш мець клопатаў, лепш сядзь."

Ці не канец гэта пэўнай цывілізацыі? І цікава, чаму гэтыя экпэрымэнты на здаровым розуме ў першую чаргу праводзяцца ў Швэцыі і Нямеччыне (дзе, як падае газэта „Тэлеграф", былі раскупленыя мільёны такіх прыладаў), а не, скажам, у Іране ці Рэспубліцы Чад. А можа там мужчыны ўжо мочацца седзячы і без акультурваньня?

Сярод сучасных мужчынаў стала модна называць сябе фэміністамі. Яны чамусьці сьвята перакананыя, што жанчынам гэта імпануе і падабаецца. Хлопцы, пакуль ня позна, спытайце ў любой нармальнай дзеўкі, якой за трыццаць, чаму яна дагэтуль незамужняя, кожную пятніцу выпівае бутэлечку-дзьве чырвонага віна, а на піжамных вечарынках, са сьлязьмі ў вачох і размазаным макіяжам на твары, расказвае сяброўкам, што ўсе мужыкі – бабы.

Ну, а каму гэткае псіхасацыялягічная ўрынатэрапія не дапаможа, хоць я чалавек даволі добразычлівы, жадаю калі-небудзь палявым спосабам патушыць вогнішча.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðâàâàíüí³:

А. Петрусевіч	70
А. Арцюхевіч	60
Н. Лазоўская	60
М. Клакоцкі	60
М. Кражова	60
В. Петрушэнка	60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

Просьба ўсім сябрам арганізацыі зьліквідаваць запазычанасьць па складках, калі такая ёсьць, за мінулы год, а таксама аднавіць ці працягнуць падпіску на наш інфармацыйны бюлетэнь "Весткі й Паведамленьні".

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

адбудзецца ў суботу **7-га сакавіка 2015 году** ў Доме Маракоў на Мангэтане па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля на другім паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку ***pahonia.com***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

М. Кражова	30
А. Петрусевіч	30
В. Петрушэнка	30
Г. Сырыська	30

Шчыры дзякуй!

*Паважаная **Ганна Шаўчэнка**, калі ласка, паведаміце рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня" **Viktar Yedzinovich**.*

Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку ***www.e-krama.com***